Тэматычная выстаўка «Будучыня за моладдзю!», прысвечаная Міжнароднаму дню моладзі, працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, перадае БелТА. Экспазіцыя раскрывае сацыяльныя, культурныя, эканамічныя і палітычныя аспекты становішча моладзі ў сучасным грамадстве. НББ прадставіла больш за 100 выданняў, сярод якіх — публікацыі замежных і айчынных аўтараў, дакументы міжнародных арганізацый на рускай і англійскай мовах. «Наведвальнікі змогуць азнаёміцца з інфармацыяй аб дзяржаўнай маладзёжнай палітыцы Беларусі, становішчы маладых людзей у сучасным свеце, іх правах, здароўі і адпачынку, аб адукацыі і рынку працы. Выстаўка ўяўляе цікавасць для выкладчыкаў, дзеячаў навукі, студэнтаў, спецыялістаў у галіне дэмаграфіі, сацыёлагаў, работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання, для ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі маладзёжнай палітыкі ў нашай краіне і свеце», — расказалі ў бібліятэцы. Выстаўка прадоўжыцца па 14 верасня.